# ЮБІЛЕЮ БССР І КПБ — НАШЫ ДАСЯГНЕННІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі Універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (1224)

ЧАЦВЕР 14 снежня 1978 г.

Цана 2 кап.

## ПА БДУ

ІНФАРМАЦЫЯ

На факультэце журналістыкі адбылося першае пасяджэнне факультэцкага літаратурнага аб'яднання «Рунь». Дэкан факультэта прафесар Р. В. Булацкі прадставіў пачынаючым паэтам былога выпускніка журфака, вядомага беларускага паэта Васіля Зуёнка.

З цікавасцю слухалі студэнты расказ аб сучасным стане беларускай паэзіі, аб тых праблемах, якія хвалююць зараз літаратараў. Васіль Зуёнак выказаў свае думкі наконт вершаў журфакаўскіх паэтаў, адзначыў недахопы іх твораў.

У заключэнне паэт пажадаў пачынаючым творчых поспехаў і натхнення.

А. АЛЕСЕЎ.

* * *

9 снежня ў Палацы спорту адбыўся канцэрт-рапарт камсамольцаў Мінскай вобласці, прысвечаны 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

У канцэрце сваё майстэрства паказалі ўдзельнікі IV Мінскага абласнога конкурсу маладых выканаўцаў камсамольска-маладзёжнай песні, шматлікія калектывы і ансамблі мастацкай самадзейнасці.

Наш універсітэт прадстаўляў народны ансамбль танца «Крыжачок» (мастацкі кіраўнік М. В. Лапша). У «Сюіце дружбы народаў» студэнты выканалі ўкраінскі народны танец «Гапак» і дагестанскую «Лязгінку». Апошні быў прызнаны лепшым нумарам святочнай праграмы.

В. САВІЦКАЯ.

* * *

«У пошуках чароўнай лямпы Аладзіна» — шматкаляровы стэнд з такой назвай паявіўся нядаўна на другім паверсе геаграфічнага факультэта ля кафедры агульнага землязнаўства. Гэта своеасаблівая справаздача студэнтаў другой групы II курса аб цікава прайшоўшай комплекснай практыцы, маршрут якой прайшоў праз гарады Фрунзе, Душанбе, Ташкент, Самарканд, Бухару. Студэнты наведалі возера Ісык-Куль, Нурэкскую ГЭС, пабывалі ў Варзобскай цясніне.

Т. АБРАМОВІЧ.



На мінулым тыдні на гістарычным факультэце адбылася навуковая канферэнцыя, падрыхтаваная студэнтамі аддзялення філасофіі, якая была прысвечана 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Уступным словам адкрыў канферэнцыю намеснік дэкана факультэта А. Г. Кляцкоў.

У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел і нямецкія студэнты.

НА ЗДЫМКАХ: з дакладам «Развіццё філасофскіх навук у Беларусі ў гады Савецкай улады» выступае доктар філасофскіх навук, прафесар А. С. Кляўчэня.

Нямецкія сябры (на пярэднім плане) у час работы канферэнцыі.

Фота М. Дубовіка.



## ВЫХОЎВАЦЬ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

Творчай атмасферай прыцягвае студэнтаў юрфака навуковы гурток дзяржаўнага права, які ўзначальвае доктар юрыдычных навук прафесар Анатоль Аляксандравіч Галаўко. Удзел у рабоце гуртка дае студэнтам не толькі дадатковыя веды ў галіне дзяржаўнага права, але і магчымасць праяўлення творчай актыўнасці ў навуковай рабоце.

На пасяджэннях гуртка абмяркоўваюцца самыя разнастайныя пытанні. Частымі гасцямі пасяджэнняў бываюць юрысты з замежных універсітэтаў. Кафедру дзяржправа і гурток нядаўна наведалі юрысты з ГДР. Падобныя сустрэчы не толькі ўзбагачаюць гуртkоўцаў вопытам калег, але і садзейнічаюць павышэнню творчай актыўнасці студэнтаў.

Аб тэмах курсавых работ, якія пішуць члены гуртка, расказаў староста М. Пастухоў. Можна пералічыць найбольш цікавыя з іх: «Акты мясцовых Саветаў і іх выканкомаў», «Развіццё прававога статуса асобы ва ўмовах агульнанароднай дзяржавы», «Права тэрытарыяльнага прыстанішча ў СССР», «Дзяржаўна-прававая адказнасць» і іншыя.

Шырокі і шматбаковы план работы на 1978-79 навучальны год стаіць перад СНТ юрыдычнага факультэта. Гэта і нарады савета СНТ з навуковымі кіраўнікамі гурткоў, і падрыхтоўка канферэнцыі па выніках вучэбна-вытворчай практыкі студэнтаў IV курса, а таксама абмен вопытам работы са студэнцкімі навуковымі таварыствамі юрыдычных факультэтаў і ВНУ краіны.

Зараз студэнты рыхтуюць свае навуковыя работы на рэспубліканскі і ўсесаюзны конкурсы. Аб справах і поспехах студэнцкіх навуковых гурткоў юрфака рэгулярна расказвае «Бюлетэнь СНТ» юрыдычнага факультэта.

Н. ЛАПЕТА.

Справы прафсаюзныя

## САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА — ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА ДНЯ

Ідучы насустрач слаўнаму юбілею рэспублікі, студэнты нашага універсітэта актыўна ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую групу, якое праходзіць пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» Гэтаму злабадзённаму пытанню прысвяціла сваю работу чарговае пасяджэнне прэзідыума прафкома універсітэта. З дакладам выступіў намеснік вучэбна-вытворчай камісіі прафкома, студэнт III курса гістарычнага факультэта Уладзімір Буцэня. У дакладзе былі ўзняты важныя пытанні, ускрыты недахопы ў рабоце асобных факультэтаў, падведзены вынікі рэйду-праверкі арганізацыі спаборніцтва на факультэтах.

Было, напрыклад, адзначана, што на юрыдычным факультэце прафсаюзныя кіраўнікі груп зусім не вядуць дзённікаў прафсаюзнага жыцця або вядуць іх фармальна, як і на радыёфізічным факультэце. Дзённік у групе — гэта надзейная падмога ў рабоце. А такое вядзенне яго, калі ўсе планы застаюцца толькі на паперы, нікому карысці не дае.

Усім вядома, што для пасяховай арганізацыі сацспаборніцтва неабходна забяспечыць яго галоснасць, якая зараз яшчэ не на ўсіх факультэтах знаходзіцца на патрэбным узроўні.

Для барацьбы з недахопамі ў рабоце неабходна рэгулярна выпускаць «баявыя лісткі», «маланкі» і нумары «КП». Гэта работа добра вядзецца на факультэтах радыёфізікі і электронікі і геаграфічным.

А вось работа па падрыхтоўцы да сесіі добра наладжана на юрыдычным факультэце, дзе створаны спецыяльныя камісіі па праверцы гатоўнасці да сесіі бібліятэкі і чытальных залаў.

У пасяховым вядзенні спаборніцтва не апошнюю ролю адыгрывае работа ленінскіх пакояў у інтэрнатах. На пасяджэнні была заслухана справаздача старшыні студсавета інтэрната № 1 Андрэя Гарбацкага па выніках рэйду-праверкі ленінскіх пакояў інтэрната №2, дзе далёка не ўсё добра. У непрыглядным стане знаходзіцца ленінскі пакой біялагічнага факультэта, дзе адзінай адметнасцю з'яўляюцца партрэты вучоных-біёлагаў і няма матэрыялаў, адлюстроўваючых жыццё краіны, гістарычныя падзеі: XXV з'езд КПСС, XI Міжнародны фестываль моладзі і студэнтаў на Кубе, 60-годдзе ВЛКСМ, Алімпіяда-80, юбілей рэспублікі і Кампартыі БССР. Не лепшыя ленінскія пакоі хімікаў і географаў.

Галоўную ўвагу пасяджэнне прэзідыума прафкома ўдзяліла выпрацоўцы агульных мер па ліквідацыі недахопаў. Вырашана ў бліжэйшы час выправіць памылкі і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва шырокім фронтам, уцягваючы ў яго кожнага студэнта.

Л. БЕРДНІК.
(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).

## Арыенцір дзейнасці

У бягучым навучальным годзе зноў пачала сваю работу школа прафсаюзнага актыву. На сваё першае пасяджэнне сабраліся прафгрупоргі, члены прафбюро факультэтаў і прафкома БДУ.

Перад студэнтамі выступіў старшыня прафкома М. М. Дрозд. Ён завастрыў увагу на выкананні прафсаюзнай арганізацыяй універсітэта мерапрыемстваў па дастойнай сустрэчы 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

М. М. Дрозд падкрэсліў, што з кожным годам усё большае значэнне надаецца падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Таму прафбюро факультэтаў павінны асобую ўвагу аддаваць барацьбе за павышэнне якасці ведаў студэнтаў, за паляпшэнне вучэбнай дысцыпліны. У сувязі з гэтым прафсаюзным арганізатарам трэба ўцягваць як мага больш юнакоў і дзяўчат у навукова-даследчую работу.

Ва універсітэце ў мінулым годзе праводзіўся агляд-конкурс на лепшую вучэбную групу. Пераможцам стала група студэнтаў аддзялення палітэканоміі гістфака, якая і сярод ВНУ рэспублікі заняла першае месца. Такія конкурсы дапамагаюць пераняць вопыт лепшых у арганізацыі не толькі вучобы, але і палітычна-выхаваўчай работы, адпачынку і г. д.

У кампетэнцыю прафсаюзнай арганізацыі ўваходзяць яшчэ і пытанні эстэтычнага выхавання і арганізацыі спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў.

Наогул прафсаюзная работа ва універсітэце значна актывізавалася. У гэтым вялікая заслуга школы прафактыву.

Школа заўсёды школа. Тут вучаць, даюць тыя неабходныя ў прафсаюзнай дзейнасці веды, якіх так не хапае першапачаткоўцам. Таму ўжо на першых занятках прафгрупоргі атрымалі многа карыснага. Цяпер яны ведаюць, як правесці прафсаюзны сход, напісаць пратакол, скласці план работы сваёй прафгрупы.

Арыенцір усёй далейшай дзейнасці ўзят.

А. АНТАНЮК,
студэнтка II курса журфака.

# Адкуль жа фармалізм?

Працягваем дыскусію

Праблема лекцый як элемента грамадска-палітычнай практыкі на даны момант паўстае не толькі перад студэнтамі факультэта журналістыкі.

У кожным будатрадзе ёсць лектарскія групы. Але часта бывае так, што падборам лекцый займаюцца не ўдзельнікі лектарскай групы, а камандзір ці камісар атрада.

Перад ад'ездам на месца работы мы сабралі рэфераты па семінарскіх занятках і нават захапілі з сабой некаторыя не свае. Знаходзіліся яны ў камісара на выпадак праверкі. Самі ж лекцыі, паклаўшы руку на сэрца, часцей за ўсё ніхто не чытае.

На мой погляд, занальныя штабы не павінны ўпускаць з поля зроку і такую важную справу атрадаў, як работа лектарскай групы.

**В. ЛАНЬКО,**
**студэнт ФПМ.**

* * *

Сутыкнуўшыся бліжэй з работай нашай лектарскай групы, я зразумела, што галоўнае ў гэтай рабоце не ў тым, каб прачытаць лекцыю, а ў тым, каб паставіць пячатку на пуцёўцы. Людзі, якія не маюць ніякага жадання займацца лектарскай работай, ідуць у лектарскую групу. Бо трэба ж мець пастаяннае даручэнне, таму што наперадзе грамадска-палітычная атэстацыя. А калі ў цябе ёсць магчымасць запоўніць пуцёўку, то тым самым табе «4» па грамадска-палітычнай атэстацыі забяспечана.

Фармальна запоўненыя пуцёўкі ідуць у таварыства «Веды». І ў выніку ў нас «чытаецца» вялікая колькасць лекцый. Аб гэтым упамінаецца амаль ва ўсіх дакладах аб праробленай рабоце. Каму гэта патрэбна? Усе ж мы ведаем, што некаторая частка лекцый, аб якіх гавораць як аб прачытаных, не чыталася.

Мне здаецца, што займацца лектарскай работай павінны тыя, хто гэтага сам жадае. І меркаваць аб рабоце трэба не па колькасці запоўненых пуцёвак, а па колькасці прачытаных лекцый. Няхай замест дзесяці «ліпавых» будзе прачытана адна сапраўдная лекцыя, але такая, каб у чалавека, які яе наведаў, узнікла жаданне паслухаць дакладчыка яшчэ.

**І. КАРАВАЯ,**
**студэнтка мехмата.**

* * *

Студэнт прадстаўляе таварыства «Веды». Але аб якіх жа ведах можа ісці гаворка, калі слухач пачуе агульнавядомыя фразы, тыпу: «імперыялізм — крыніца войнаў», «сям'я—першы выхавацель» і г. д. Ды нікому і не захочацца слухаць лектара, які скарагаворкай адбубніць перапісаны з кнігі ці газеты тэкст. У тым, што лекцыйная работа на факультэтах стала фармальнай, ёсць частка віны і таварыства «Веды». Так, за два гады навучання ва універсітэце на нашым курсе ні разу не пабываў прадстаўнік гэтай паважанай арганізацыі. А калі мы ад'язджалі на першую азнаямленчую практыку ў раённыя газеты, то не мелі нават стандартных бланкаў, дзе павінна быць запісана назва лекцыі і сціслая яе рэцэнзія. Чаму? Не выдалі нам прадстаўнікі таварыства «Веды» пуцёвак, бо не было іх. Добра, што на месцы, у райкоме партыі, нам пазычылі бланкі, і адпаведны запіс быў зроблен.

Лекцыя ўсхвалюе слухачоў, калі яны пачуюць цікавыя лічбы, факты, абагульненні. А гэта азначае, што студэнт добрасумленна аднёсся да складанай работы па палітычнаму выхаванню рабочых, калгаснікаў, школьнікаў, і сведчыць аб сацыяльна-палітычных якасцях самога студэнта.

**А. ЦВЯХ,**
**студэнт журфака.**

* * *

Прачытаў водгук П. Уладзімірава («Беларускі універсітэт» № 34). Міжволі прыходзіш да заключэння: ад фармалізму не пазбавімся, калі будзем паступаць так, як гэта робіць аўтар. Хочацца прывесці яго словы: «Я заўжды, тут жа, пачынаю прыкідваць: дзе ж і як «ціскануць» на тыя пуцёўкі пячатку...»

Вось тут, за шчырым прызнаннем — нічым не прыкрытая раўнадушнасць, напляваельскія адносіны, якія параджаюць фармалізм.

Цяжка не пагадзіцца з выказваннямі, што адсутнасць вопыту, дастатковай падрыхтоўкі не дазваляе на першых парах чытаць лекцыі на высокім узроўні. Лектарскаму майстэрству неабходна вучыцца, тым больш нам, журналістам. Пры жаданні можна займацца і на лектарскім аддзяленні, якое існуе на факультэце грамадскіх прафесій.

І ўсё ж як вырашыць праблему, узнятую Л. Чыжовай?

Мяркую, што ў першую чаргу трэба паклапаціцца аб новых формах падрыхтоўкі лекцый. Устанавіць ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях факультэтаў, акрамя лектарскіх груп, кансультацыйныя пункты па падрыхтоўцы да выступлення студэнтаў перад працоўнымі. Але галоўнае, на мой погляд, не імкнуцца да таго, каб табе «ціcканулі» пячатку на пуцёўку, а зразумець неабходнасць і важнасць лекцыйнай прапаганды.

**А. САЛАМАХА,**
**сакратар камітэта камсамола журфака.**

* * *

Я не згодна з меркаваннямі тых, хто лічыць нашы лекцыі нікому не патрэбнымі.

На першай сваёй практыцы, як і большасць студэнтаў нашага факультэта, я выступала з лекцыямі ад таварыства «Веды». Мая аўдыторыя — гэта школьнікі, бібліятэкары, выхавацелі.

Спачатку думала, што нічога ў мяне не атрымаецца, не зацікавяцца людзі. А калі стала расказваць пра свой факультэт, пра сваю будучую прафесію, усё атрымалася прасцей, чым уяўлялася спачатку. Аудыторыя ўважліва слухала. Мая няўпэўненасць была дарэмнай. Мне шмат задавалі пытанняў, асабліва школьнікі. Іх цікавіла, як рыхтуюцца матэрыялы да друку, якія тэмы трэба падбіраць, каб яны прыцягнулі ўвагу чытача, прымусілі яго задумацца над матэрыялам.

Яшчэ вучняў цікавіла, як найлепш, цікавей і змястоўней выпусціць насценную школьную газету.

Мая думка: лекцыі чытаць патрэбна. Было б толькі жаданне.

**В. ШКАЛА,**
**студэнтка журфака.**

* * *

Усім вядома, што лекцыя будзе цікавай толькі ў тым выпадку, калі яе чытае падрыхтаваны лектар. Для таго, каб са студэнта атрымаўся добры лектар, трэба арганізаваць іх вучобу. Тое-сёе ў гэтым напрамку робіцца на гістарычным факультэце. Тут некалькі год назад была створана школа маладога лектара. Спачатку ўсё ў ёй ішло добра: кваліфікаваныя дакладчыкі расказвалі пачынаючым аб лектарскім майстэрстве, праводзілі практычныя заняткі. У мінулым годзе работа затухла і ажывілася толькі перад заканчэннем навучальнага года. Сёлета спахапіліся крыху раней, за месяц да сесіі, цяпер, праўда, зімовай. Але многія студэнты, якія раней наведвалі заняткі школы маладога лектара, адмовіліся зноў наведваць яе. Шкада дарэмна патрачанага часу. І ўсё ж такая вучоба нам вельмі патрэбна, але толькі добра наладжаная, яна зможа прынесці карысць.

Яшчэ адзін бок праблемы мне хацелася б закрануць. Перад тымі студэнтамі, якія могуць выступіць з добра падрыхтаванай лекцыяй, паўстае пытанне: «Дзе чытаць?». Яно б не паўставала, калі б камітэт камсамола факультэта ці камсамольскія бюро курсаў наладзілі кантакт з кіраўніцтвам прадпрыемстваў і ўстаноў. Лектар загадзя ведаў бы, каму адрасаваць свае выступленні.

**А. ЛІТВІН,**
**студэнт гістфака.**

### АД РЭДАКЦЫІ

**Лекцыя як элемент грамадска-палітычнай практыкі: якой яна павінна быць? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да чытачоў, змяшчаючы заметку Л. Чыжовай «Я б у лектары пайшоў...» («Беларускі універсітэт № 33»). У адказ атрымалі нямала пісьмаў. Як пазбавіцца фармалізму ў лектарскай рабоце, як зрабіць лекцыю карыснай і для слухачоў, і для самога студэнта-лектара? Праблемы гэтыя зацікавілі будучых журналістаў, матэматыкаў, гісторыкаў і іншых. Яны спрачаюцца, выказваюць канкрэтныя прапановы па паляпшэнню лектарскай работы студэнтаў.**

**На думку рэдакцыі, таварыству «Веды» прыйшоў ужо час выказаць свае рашаючыя меркаванні.**

Да Дня балгарскіх студэнтаў

# СА СВЯТАМ, ДРУГАРЫ!



**Восьмага снежня — Дзень балгарскіх студэнтаў. Юнакі і дзяўчаты брацкай рэспублікі, якія займаюцца ў ВНУ нашай сталіцы, адзначалі сваё свята ў актавай зале Беларускага політэхнічнага інстытута. У прэзідыуме — выкладчыкі, студэнты, шматлікія госці.**

**Традыцыя адзначаць Дзень студэнтаў Балгарыі ідзе ў далёкае мінулае краіны і звязана з імем Клімента Ахрыдскага.**

**Першая навучальная ўстанова ў Балгарыі была адкрыта ў канцы дзевятнаццатага стагоддзя, у 1888 годзе. У ёй навучаліся сорак тры студэнты. А цяпер толькі ў Сафійскім універсітэце займаецца дзесяць тысяч студэнтаў, якія слухаюць лекцыі дзевяцісот сямідзесяці выкладчыкаў.**

**Гістарычны лёс балгарскага народа непарыўна звязан з лёсам рускіх братоў. Ад часоў Кірылы і Мяфодзія, бітвы на Шыпцы, падзей, звязаных з імем рэвалюцыянера і барацьбіта Георгія Дзімітрова, і да нашых дзён адчуваецца цесная сувязь нашых брацкіх народаў. Гэта дружба яскрава праяўляецца і зараз, калі балгарскія студэнты ў семдзесят шосты раз адзначалі сваё свята.**

**У зале гучалі галасы прадстаўнікоў многіх краін свету. Віншавалі сваіх сяброў студэнты з Алжыра, Лівана, Шры-Ланкі, Конга, Польшчы, ГДР, Венесуэлы. Цёпла прагучала прывітанне піянераў са 144-й сярэдняй школы г. Мінска.**

**У перапынку перад канцэртам сваімі ўражаннямі падзяліўся студэнт V курса ФПМ універсітэта, балгарын Пётр Тонеў:**

**— Вельмі прыемна бачыць, што на наша свята прыйшло так многа сяброў. Адчуваецца сапраўдная інтэрнацыянальная дружба. Я не разумею ўсіх замежных моў, але нас, студэнтаў з розных дзяржаў, здружыла вялікая руская мова, мова Леніна, ідэі якога жывуць і перамагаюць. У гэты святочны час я не адчуваю, што знаходжуся далёка ад сваёй Балгарыі. Краіна Саветаў стала мне другім домам. І, безумоўна, сумна крыху ад таго, што хутка прыйдзецца развітацца з гасцінным Мінскам, з савецкімі сябрамі.**

**М. ДУБОВІК.**
Фота аўтара.



**НА ЗДЫМКАХ:** выступаюць балгарскія студэнты.

# «ПРА ЧАС І ПРА СЯБЕ»

Студэнты першай групы II курса фізічнага факультэта пад кіраўніцтвам свайго куратара Рагнеды Фёдараўны Апацёнак і супрацоўнікаў універсітэцкай бібліятэкі правялі нядаўна цікавы дыспут на тэму «Пра час і пра сябе». Гасцямі студэнтаў і адначасова ўдзельнікамі дыспуту сталі маладыя рабочыя вытворчага аб'яднання «Інтэграл».

Актыўна і горача абмяркоўваліся на дыспуце пытанні аб самавыхаванні, аб правядзенні свабоднага часу, аб каханні, аб сучасных праблемах моладзі.

Прысутных цікавіла: Ці можна выхаваць сябе? Ці можна змяніць свой характар? Якія пачуцці трэба культываваць у сабе, якія — перамагаць?

— Кожны чалавек павінен сам выхоўваць сябе, — лічыць Сяргей Дзянісаў.

— Іменна воля з'яўляецца, на мой погляд, галоўнай дзейснай рысай чалавека, які імкнецца перавыхаваць сябе ці зжыць у сабе, у сваім характары якую-небудзь адмоўную рысу, — даказвае Таня Лубеннікава.

На дыспуце многа гаварылася аб тым, што важна зразумець дыялектыку адносін: людзі —прадукты абставін, і абставіны змяняюцца людзьмі. Гэта дыялектыка мае самы прамы, непасрэдны ўплыў на выхаванне асобы. У сваю чаргу асоба павінна ўнесці свой уклад у далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, удасканаленне грамадскіх адносін, рост духоўнага патэнцыялу грамадства. Узнікае спрэчка аб асобе: што такое асоба, ці трэба быць чалавекам моцнай волі, каб па-сапраўднаму кахаць.

— Чалавек павінен быць асобай, —гаворыць студэнтка фізфака Галя Васільева, — павінен і можа выхоўваць у сабе волю, калі патрабуецца знайсці сілы на подзвіг, як знайшоў у сабе гэтыя сілы чалавек, што паўтарыў лёс Мікалая Астроўскага. Гэта народны артыст Казахскай ССР Кенэнбай Кажабекаў. Аб асобе спрачаліся шмат, але ўсе сышліся на тым, што дыспут усхваляваў усіх. Ён дапамог студэнтам і рабочым праверыць свае ўласныя погляды і думкі, выслухаць узаемныя пярэчанні, аргументы, зацвердзіцца ў сваёй думцы або, наадварот, адмовіцца ад свайго пункту гледжання. Вельмі тактоўна, пераканаўча вёў дыспут выкладчык этыкі і эстэтыкі П. Н. Савасцёнак. Кампетэнтны вядучы дапамог моладзі разабрацца ў многіх пытаннях. Актыўна, творча праявілі сябе студэнты I групы на дыспуце. Яны паказалі, што ім дарагія тыя перакананні, якія яны адстойвалі.

Становіцца ўсё больш неабходнай выпрацоўка такіх рыс, уласцівасцей асобы, якія дазваляюць ёй быць добраахвотным і свядомым грамадскім творцай. Фарміраванне ў савецкіх людзей камуністычнага светапогляду, калектывізму, справядлівасці, пачуцця доўгу, сумленнасці, чуласці і ўвагі да блізкага і іншых высокамаральных якасцей у ходзе сцвярджэння камуністычных адносін становіцца неабходным патрабаваннем дня.

**Н. КАВЕРЫНСКАЯ,**
**адказная за сектар масавай работы бібліятэкі БДУ.**

# СВЕДКА СТУДЭНЦКІХ СПРАЎ

Цяжка ўявіць сабе студэнцкае жыццё без «баявога лістка». У будатрадах, на сельгасработах, у святы і ў вучэбныя будні адзначае цікавыя падзеі нашага жыцця «баявы лісток» — сведка студэнцкіх спраў.

На механіка-матэматычным факультэце конкурс на лепшы «баявы лісток» стаў традыцыйным. Ён прысвячаецца трэцяму працоўнаму семестру. А слава будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадаў не абмінула факультэт. СБА «Кастрычнік», «Волаты», «Атланты» — гонар не толькі мехмата, але і ўсяго універсітэта. Першае месца сярод сельскагаспадарчых атрадаў універсітэта, першае месца сярод СБА Наваржэўскай зоны — такія факты красамоўна гавораць самі за сябе.

«Нельга з поўным правам называцца студэнтам, калі ты не пабываў у будатрадзе. Тут іншамоўнае слова «рамантыка» гучыць па-руску — «работа», — пішуць трэцякурснікі мехмата ў сваім «баявым лістку».

— Калі вам цікава ўявіць сабе атмасферу жыцця і работы ў нашым атрадзе, — сказала камандзір СБА «Стэлуца» Галіна Глобуз, — звярніцеся да нашых «баявых лісткоў».

Сапраўды, яны расказваюць пра многае. Быццам бачыш крыху стомленыя пасля напружанага дня твары, узбуджаныя новым працоўным дасягненнем. Разам з байцамі атрада спрачаешся, разам смяешся з удалага жарту. Словам, усё разам.

— «Баявы лісток», — расказвае адказная за лекцыйна-прапагандысцкі сектар камітэта камсамола мехмата, член журы конкурсу Таццяна Якутовіч, — свайго роду летапіс вялікіх і малых спраў студэнцкага жыцця. І зразумела, у цікавым змесце, арыгінальнасці афармлення «баявых лісткоў» не адмовіш рэдкалегіям. Але, на думку журы, лепшыя лісткі павінны быць сціслымі, змястоўнымі і аператыўнымі.

Пераможцамі на гэтым конкурсе адзначаны студэнты II курса першага патоку і III курса другога патоку.

І ў канцы хацелася б зрабіць невялічкую заўвагу: на конкурс кожны з удзельнікаў прадставіў адзіны, лепшы з лепшых «баявых лісткоў», а якія ж астатнія «баявыя лісткі» ў пераможцаў? Цікавей і больш правільна, на маю думку, было б праводзіць агляд-конкурс, на якім яго ўдзельнікі маглі б шырэй прадставіць свае «баявыя лісткі», падзяліцца сваімі дасягненнямі.

**І. ТОЎСЦІК,**
**студэнтка журфака.**



Хутка сесія... Фотаэцюд **М. Дубовіка.**

# ЖЫЦЦЁ ІНТЭРНАЦКАЕ

На дзевятым паверсе інтэрната нумар сем жывуць студэнты факультэта журналістыкі. Ленінскі пакой у нас на паверсе адначасова з'яўляецца пакоем для заняткаў і адпачынку. Тут чыста і неяк па-хатняму ўтульна. Фотаздымкі на стэндах расказваюць пра вучобу, працу і адпачынак. А вось стэнд «Заву цябе Расіяю» расказвае аб прыгожых кутках нашай Радзімы. Пад загалоўкам «Маладосць мая, Беларусія» сабраны цікавыя матэрыялы пра нашу рэспубліку, пра дасягненні і поспехі беларускага народа.

Выдатна папрацавалі над афармленнем пакоя старшыня прафсаюзнай арганізацыі факультэта Аляксандр Уліцёнак, старшыня студсавета Аляксей Веруш і стараста паверха Мікалай Касяк. Нядрэнна ў нас наладжана спаборніцтва за добры санітарны стан жылых пакояў. На спецыяльным экране рэгулярна вывешваюцца вынікі спаборніцтва.

А Віктар Філіпчык, адказны за работу спартыўнага сектара, арганізаваў у інтэрнаце першынство факультэта па настольнаму тэнісу.

**В. ПАТАПЕНКА,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі.**

## Нашы выпускнікі

# ЛЕТАПІС РЭСПУБЛІКІ



У творчым аб'яднанні «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» працуе каля 150 чалавек. І вельмі прыемна, што кожны дзесяты з'яўляецца выпускніком факультэта журналістыкі нашага універсітэта.

Амаль чвэрць стагоддзя працуе ў дакументальным кіно Р. З. Ясінскі. А пачалося з дыпломнай работы студэнта журфака «Беларускае дакументальнае кіно», якая і стала для яго сімвалам далейшага жыцця. Пачаўшы з рэдактара, сёння Р. Ясінскі — вядомы рэжысёр, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, аўтар фільмаў «Нас вадзіла маладосць», «Штрыхі да партрэта», «Далёкае і блізкае», фільмаў, якія адразу заваявалі ўвагу гледачоў.

Такі ж шлях і ў рэжысёра В. Дашука, які за шэраг фільмаў, прысвечаных беларускаму народу, стаў лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і заслужаным дзеячам мастацтваў БССР. Гэта — «Жанчына з забітай вёскі», «Нямы крык», «Расстраляная песня» і іншыя.

Лёс жа кінааператара Анатоля Алая склаўся інакш. Ва універсітэт ён прыйшоў, калі працаваў на кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў асістэнтам аператара. Спалучаючы творчую працу з вучобай, А. Алай прайшоў усе ступені кінематаграфічнага шляху: асвятляльніка, асістэнта аператара, в. а. аператара. Сёння А. Алай — адзін з вядучых кінааператараў аб'яднання «Летапіс», сакратар пярвічнай партарганізацыі, выдатнік кінематаграфіі СССР. Ён атрымаў прызы і дыпломы рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных фестываляў.

І толькі арганічнае перапляценне журналістыкі з прафесіянальнымі навыкамі кінааператара дапамагло яму стаць вядомым кінапубліцыстам. «Шлях да Арыёна» (аб касманаўце П. Клімуку), «Аб маці можна расказваць бясконца» (партрэты жанчын-патрыётак), «Бессмяротны подзвіг Мінска» (аб прыездзе ў Мінск Л. І. Брэжнева) і многія іншыя кінастужкі сведчаць аб высокім майстэрстве кінадакументаліста. Але, захапляючыся творчасцю кінахранікёра, А. Алай знаходзіць час і натхненне, каб пастаянна пісаць для рэспубліканскіх газет і часопісаў. Ён вядомы і жаданы госць у разнастайных выдавецтвах Беларусі.

Нельга не адзначыць тую жыватворную сілу, тое ўзаемаўзбагачэнне, якое прыносяць традыцыйныя творчыя сустрэчы ў Доме кіно журналістаў і кінаработнікаў пад рубрыкай «Яднанне пяра і кінакамеры». Гэтыя сустрэчы дазваляюць абменьвацца ўражаннем, абмеркаваць тую ці іншую кінастужку, аповесць ці нарыс.

Сёння наша рэспубліка знаходзіцца напярэдадні вялікага юбілею — 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. І беларускія летапісцы сустракаюць надыходзячае свята стварэннем юбілейных кінастужак. Галоўны фільм года — «Далёкае і блізкае». Гэта — біяграфія рэспублікі, сацыяльны партрэт яе народа. Дарэчы, аўтары — рэжысёр Р. Ясінскі, аператар А. Алай.

Аб слаўным 60-гадовым шляху Беларускай ваеннай акругі паведаміць гледачам поўнаметражны фільм «Беларускі Чырванасцяжны».

Старэйшы беларускі рэжысёр-аператар І. Вейнаровіч, галоўны аператар А. Алай стварылі кінафільм «Бессмяротны подзвіг Мінска», прысвечаны прыезду ў нашу рэспубліку Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева і ўручэнню гораду-герою Мінску ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

Усе намаганні кінадакументалістаў накіраваны на тое, каб дасціпней, выразней адлюстраваць старонкі гераічнага летапісу нашай рэспублікі, гістарычныя здзяйсненні партыі, усяго беларускага народа.

Яднанне пяра і кінакамеры знаходзіць сваё ўвасабленне ў яскравым адлюстраванні падзей сучаснага нашага жыцця.

**А. ДАНЕЦ.**



**На здымку:** аператар А. Алай і рэжысёр Р. Ясінскі (крайні справа) на здымках фільма «Далёкае і блізкае».

Фота **аўтара.**

# НА СЕЛЬСКАЙ СЦЭНЕ

Адбылася чарговая сустрэча студэнтаў філалагічнага факультэта з вучнямі падшэфнай Хатлянскай сярэдняй школы. Падобныя мерапрыемствы заўсёды прыемныя і для шэфаў і для падшэфных. Нас тут чакалі, сустрэлі як дарагіх гасцей.

Час за абменам думкамі, новымі знаёмствамі праляцеў непрыкметна. Нам было прыемна бачыць у зале калгаснага Дома культуры не толькі падшэфных вучняў. На сустрэчу прыйшлі калгаснікі, мясцовая інтэлігенцыя.

Перад пачаткам канцэрта мы расказалі пра наш універсітэт. Вельмі добра сустрэлі гледачы канцэртную праграму. Дарэчы зазначыць, што наш канцэрт быў разлічан на адну гадзіну, а працягваўся дзве з паловай. Нумары прыдумваліся экспромтам, проста па ходу канцэрта.

У тым, што сустрэча і канцэрт прайшлі з поспехам, — заслуга актыўных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці факультэта Ірыны Уласавай, Станіслава Валейкі, Веры Баёк, Ніны Жаўнерчык, Наташы Давідовіч і іншых.

**Л. БУЦЭЛЕВА,**
**студэнтка II курса філфака.**

# СВЯТА ФІЗІЁЛАГАЎ



Радасная, па-сапраўднаму святочная атмасфера панавала ў той вечар на біялагічным факультэце.

Тут праходзіла традыцыйнае пасвячэнне студэнтаў трэцяга курса ў фізіёлагі. І яшчэ — адзначаўся дзесяцігадовы юбілей з дня нараджэння гэтай добрай традыцыі.

Гімнам фізіёлагаў прывіталі гасцей студэнты чацвёртага курса, адказныя за святочны вечар.

Слова бярэ дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл Антаніна Георгіеўна Сташонак. Яна цікава расказала аб тым, як рабіліся першыя, няхай яшчэ зусім нясмелыя, крокі ў арганізацыі такіх вечароў. Трапным гумарыстычным словам намалявала яна дзесяцігадовую гісторыю існавання гэтага цудоўнага свята.

На сцэне зноў чацвёрты курс. Шмат апладысментаў дасталося Яўгену Харчанку, галоўнаму рэжысёру новага самадзейнага фільма «Пра каханне і пра нас».

Затым — абрад пасвячэння ў фізіёлагі. Ён праходзіў у форме вусных экзаменаў. Трэцякурснікі павінны былі адказаць у гумарыстычнай форме на некалькі пытанняў, пастаўленых у білетах. Экзамен вытрыман бліскуча. За самыя вострыя, трапныя адказы ўручаліся прызы. Уноў пасвячоным былі ўручаны памятныя значкі-эмблемы фізіёлагаў.

Па традыцыі ў іх сям'ю былі залічаны госці, студэнты Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі, што прыехалі на свята.

Віноўнікі ўрачыстасці паказалі цікавую літаратурна-музычную кампазіцыю па матывах казкі «Царэўна-жаба». Потым яшчэ доўга на біяфаку гучалі віншавальныя словы, чуліся песні. музыка.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**

# РУЖОВЫ РАНАК

літаратурная старонка

Ала КАНАПЕЛЬКА

## ТУТ МОЙ ДОМ...

Дым плыве над зямлёй,
Дагарае каліўе.
Над разлогай палёў
Ціш нямая калее.

Дым клубамі паплыў,
Дым гаркава-салодкі,
І маленства цяплынь
Хуткавёслаю лодкай...
Тут мой дом, тут мой кут,
Родны ў вёсны і ў зімы.

Пачынаецца тут
І мой шлях, і Радзіма.
І як дыму сувой,
Шлях мой коціцца ўдалеч.
І так цягне дамоў,
Калі каліўе паляць.

Як туманы, дымы
Паўстаюць за платамі.
Выплываюць дамы,
Нібы з хваль, на спатканне.
Бацька з маці ў двары
Ладзяць вілы і граблі
— А, дачушка! Бяры
Струмант. Пойдзем на грады!..
Вецер горне да ног
Агурочнік, бульбоўнік.

Жоўты кроп, што пасох,
Заграбаем любоўна.
...Дым плыве над зямлёй,
Дагарае каліўе.
Над разлогай палёў
Ціш нямая калее...

## САЛАЎІ

Сігануць мне іншы раз ахвота
Ад транзістарнага трэску,
нудных слоў
З д'яблямі ў прыціхшае балота,
Каб наслухацца дасхочу
салаўёў.

Не прывыклі ногі да туманаў,
Як да росаў радасных трава.
Гаркаваты май зноў адурманіў
Песняй чарамховай салаўя.

Да галінкі цягнецца галінка,
Нібы губы, клейкія лісты.
Салаўі зайшліся ў паядынку
І са сном, і з цемрай глухаты.

Аляксандр УСЕНЯ

## ПАЛЯЎНІЧЫ

— Колькі ваўкоў увогуле?
— Так сабе і пішы:
Я іх сляпымі ў логаве
Больш сотні перадушыў.

Ды супыняцца нечага,
Буду душыць яшчэ.

...Воўчае ці чалавечае
Агеньчыкамі з вачэй?..

Тамара КАЛЬВІНКОЎСКАЯ

Белая сукенка, вочы-васількі.
Птушкай ты ляцела да
лясной ракі.
За табою следам ветрам
я імчаў.

Толькі па дарозе словы
пагубляў.
— Любая! Ну, як мне, як
табе сказаць?..
Нібы лісце, словы ў песню
не сабраць.

Глянуў я: аж словы ўжо
ў вачах тваіх.
Я згубіў. Знайшла ты і —
забрала іх.

# ПОШУК, РАДАСЦІ І ЎЗЛЁТЫ...

**У самым канцы мінулага года выйшла кніга «Вёсны», чацвёртая па ліку, у якой «Узлёт» прадстаўляў сябе. Дваццаць паэтаў і паэтэс заявілі аб сабе ў «Вёснах». Сёння прыемна сказаць, што ўжо да вёснаўцаў працягваюць далучацца ўсё новыя здольныя юнакі і дзяўчаты. І што гэта так, можна пераканацца з сённяшняй, чарговай літстаронкі. У ёй не толькі вершы студэнтаў, якія былі прадстаўлены ў «Вёснах», — Аляксандра Усені, Леаніда Пранчака, Кастуся Цыбульскага, але і, несумненна, цікавы дэбют у паэзіі студэнта IV курса гістарычнага факультэта Уладзіміра Емяльянчыка, а таксама першае знаёмства з вершамі студэнткі І курса філфака Алы Канапелькі і іншых. У больш буйным плане можна ўбачыць тут паэтычныя пошукі Леаніда Пранчака — студэнта III курса журфака, які ў «Вёснах» быў прадстаўлен адзінкавымі вершамі. Пошукі маладымі паэтамі сваіх галасоў працягваюцца.**

**Алег ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**



Леанід ПРАНЧАК

Кропу парасоны —
Агуркоў дазор.
Крочу ледзь не сонны
Свежасцю разор.

Бульбу-скараспелку
Люба сабіраць.
За кудлатай елкай
Сонца не відаць.
Адышло змяркание
За далёкі бор...
...Кошык бульбы ранняй,
Нібы кошык зор...

* * *

Сцішанасць.
Маўклівасць.
Адзінота.
Вытаптаны,
Выцвілы мурог.
Жоўтых лісцяў
Цёплыя сумёты
Птушкамі маленькімі —
З-пад ног.

Павуціння
Сонечныя знічкі
Блытаюцца ў вецце і быльнёг.
А лісты бяроз,
Нібы лісічкі,
Шыюцца пагрэцца
У шэры мох.

* * *

Маўчыць
Вярба вячыстая.
Не звоніць
Асака,
Здзіўлёна-урачыстая
Аж свеціцца рака.
Блішчыць,
Пераліваецца —
Ці зорачка, ці зман?..
Дзяўчо ў рацэ купаецца...
Туман, туман, туман.

## СОТЫ

Асалода натхнёнай работы —
Соты.
Неспакой і душы турботы —
Соты.
Пошук, радасці і ўзлёты —
Соты.
Вочы, вусны, цяпло пяшчоты...
Соты.

* * *

Вечаровы лес —
Таемны, ціхі,
Белізна бяроз
І цені хвой.
Вогненным хвастом
Старой лісіхі
Дагарала сонца над ракой.
Адцвітала, золатам купала,
Стракаталі конікі
Між траў.
У гаі
Зязюля кукавала,
Колькі раз цябе я
Цалаваў.

Кастусь ЦЫБУЛЬСКІ

Жоравы плакалі зноў —
верасень...
Босых няма слядоў
на беразе.

Круціцца лісцяў рой —
раніца...
Зноў толькі ў снах са мной —
абранніца...
Жоравы ў далячынь:
верасень...
Нашы былі сляды
на беразе...

* * *

Квет садоў —
У клёкаце бусліным,
Даль дубоў —
У звоне салаўя,

Луг — у плачы ка́ні,
Хвалі — чаіц, —
У голасе ж тваім —
Уся зямля!..

* * *

Вярба прыбегла за сяло
Страчаць світанак з намі,
І месяц, ломячы крыло,
Зваліўся за барамі.

Зязюлька, будзячы зару,
Закукавала ў гаі.

Зары, зязюлі гавару:
— Дзень добры, дарагая!..



Першы снег. Фота А. Сахашчыка.

Уладзімір ЕМЯЛЬЯНЧЫК

## ВЯСКОВАЯ ЗАМАЛЁЎКА

Росны ранак. Задуменне.
Ад бярозы — доўгі цень.
У падзеях і здарэннях
Кукарэкнуў новы дзень.

Вось праехала машына,
Задрыжэлі шыбы хат.
Гаманлівая жанчына
Снедаць кліча куранят.
Промні першыя — хлапечы
Прыпамін вясны былой:
Падварушвае ў печы
Маці сонца чапялой.

## ІШОЎ САЛДАТ...

Ішоў салдат, з чужынцам
біўся,
Каб знішчыць боль, тугу
дашчэнту.
Ад ран знямогся, прыпыніўся...
Не знаў, што стане
манументам.

* * *

Лямпе над сталом свяціцца,
Быццам зорцы над аконцам,
Песні незабыўнай ліцца
Светла, ясна і бясконца.

Будзе весела-вясёла,
Па-харошаму крылата,
Быццам песні мае ў сёлах
Ведаюць, пяюць дзяўчаты.

Да крыніц жывых прыпасці —
Да вялікага даверу:
І бяду сваю, і шчасце
Толькі роднай мовай змеру!..

## ПАРКАЛЁВАЯ СУКЕНКА

Паркалёвая сукенка,
Вочы, проста вочы...
На тваю красу, Аленка,
Мы глядзець не хочам.

Цалавала цябе сонца —
Рыжынак, як мора, —
Раўнадушныя бясконца
Да твайго мы гора.

Не балела, не калола,
Для каго ты, хто ты —
«Тут, — казаў дырэктар, —
школа,
А каханне — потым...»

Клас дзесяты, клас апошні,
Вясёлы і сумны,
Ах, які неасцярожны,
Шчыра лёгкадумны!

Паркалёвая сукенка...
Зноў бяссонне ў ночы, —
Хоць бы сніць цябе, Аленка,
Вочы, проста вочы!..

## З НАРОДНАГА...

— А нашто табе каса?..
— Каб міламу цешыцца!
— А як пойдзе да другой?..
— У бары павесіцца.

— А нашто табе сляза?..
— Каб ліхое лінула...
— А што сэрцайка ў руцэ?..
— Для мілога вынула!..

Рэдактар А. ДЗЕРАШ

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 1894. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 02614